Ірына Барысаўна Акуловіч

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Ірына Барысаўна Акуловіч (нар. 1974, Магілёў) — дзяржаўны дзеяч Беларусі.

Ірына Барысаўна Акуловіч	
Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу	
Нараджэнне	1974 Магілёў, Магілёўская вобласць, БССР, СССР
Адукацыя	МДУ імя А. А. Куляшова
Месца працы	Беларускае тэлеграфнае агенцтва

Біяграфія

Нарадзілася ў 1974 годзе ў Магілёве. Скончыла Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. А. Куляшова. Была музычным кіраўніком у садку-яслях № 46, а яшчэ пазней настаўніцай малодшых класаў у школе №21[1].

Працавала на розных пасадах у Магілёўскім абласным тэлерадыёаб'яднанні, прайшла шлях ад уласнага карэспандэнта да загадчыцы карэспандэнцкага пункта ў Магілёве Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі. З 2009 да 2018 года працавала дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства радыётэлецэнтра «Тэлерадыёкампанія «Магілёў». Выбрана членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу шостага склікання ад Магілёўскай вобласці, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.

5 красавіка 2018 назначана генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускае тэлеграфнае агенцтва»[2].

Зноскі

1. nashaniva.by (https://nashaniva.by/?c=ar&i=207620)
2. blr.belta.by (http://blr.belta.by/president/view/gendyrektaram-belta-naznachana-iryna-akulovich-67761-2018/)

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Ірына_Барысаўна_Акуловіч&oldid=3661571"